ПРОЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЕДНАЙЦЕСЯ!

ЗАРА

орган Брэсцкага абкома КП(б)Б і аблвыканкома

№ 235 (307) | Нядзеля 13 кастрычніка 1940 г. | Цана 10 кап.

Указ Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР

Аб дні выбароў у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР.

1. Назначыць выбары ў абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у Баранавіцкай, Беластоцкай, Брэсцкай, Вілейскай і Пінскай абласцях Беларускай ССР на 15 снежня 1940 г.

2. Аб'явіць пачатак выбарчай кампаніі па выбарах у абласныя, раённыя, гарадскія, сельскія і пасялковыя Советы дэпутатаў працоўных у гэтых абласцях з 15 кастрычніка 1940 г.

г. Мінск. 12 кастрычніка 1940 г.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Н. НАТАЛЕВІЧ
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета БССР Л. ПАПКОЎ

Выканаць кантрактацыйныя дагаворы па здачы ільнопрадукцыі

Каб наша тэкстыльная прамысловасць працавала паспяхова і з года ў год нарошчвала сваю вытворчасць яе трэба бесперабойна і ў дастатковай колькасці забяспечваць неабходнай сыравінай. Адсюль зразумела, што своечасовае выкананне кантрактацыйных дагавораў па здачы дзяржаве ільнопрадукцыі мае выключна важнае значэнне. Як-жа абстаіць справа з загатоўкамі ільнопасення, первічнай апрацоўкай ільну і здачай валакна дзяржаве ў нашай вобласці?

Трэба прама сказаць, што гэта важнейшая сельскагаспадарчая работа пушчана на самацёк. План загатовак ільнопасення па становішчу на першае кастрычніка вобласць выканала ўсяго на 18 процантаў. Толькі адзін Жабінкаўскі раён поўнасцю разлічыўся з дзяржавай па здачы насення ільну. За ім следуе Гайнаўскі раён, які загатовіў ільнопасення 72 процанты плана.

Камянецкі раён, які ўвесь час адстае па ўсіх відах загатовак сельскагаспадарчых прадуктаў, выканаў план здачы ільнопасення дзяржаве ўсяго на адзін процант. У Косаўскім раёне выкананне плана складае 5 процантаў, Высокаўскім — 5,6 процанта, Ружанскім — 7 процантаў.

Партыйныя і совецкія арганізацыі гэтых раёнаў і ў першую чаргу кіраўнікі спажывецкай кааперацыі, на якой ляжыць абавязак праводзіць загатоўку ільнопрадукцыі, праяўляюць паўнейшую недаацэнку ільну. Толькі адсутнасцю ўвагі і прамога нежадання кіраўнікоў спажывецкай кааперацыі арганізаваць работу можна вытлумачыць той факт, што ў радзе раёнаў сельскія спажывецкія таварыствы і крамы не падрыхтаваны да прыёмкі ільнопасення.

Кіраўнікі Калазубскага сельпо, Ружанскага раёна і райспажыўсаюза не паклапаціліся забяспечыць крамы патрэбнай колькасцю гір. У выніку гэтага адатчыкі ільнопасення вымушаны цярпець многа пакут. Каб здаць дзесяць кілограмаў насення ільну крамшік вымушаны важыць гэтую колькасць па частках некалькі раз. Аналагічнае становішча назіраецца ў радзе сельскіх спажывецкіх таварыстваў іншых раёнаў.

На пытанні загатоўкі ільнопрадукцыі вельмі слаба праводзіцца масава-растлумачальная работа сярод насельніцтва. Асобныя кіраўнікі спажывецкіх кааперацый нярэдка разважаюць так: „Кантрактацыйныя дагаворы заключаны, тэрміны здачы ільнопрадукцыі ўказаны, што нам яшчэ больш трэба". Яны думаюць, што насенне ільну будзе загатоўлена самацёкам. Практыка-ж паказвае зусім адваротнае. Усякі поспех заваёўваецца ўпартай і настойлівай работай у масах.

Гэта павінны зразумець у кожным раёне. Трэба шырока разгарнуць масава-растлумачальную работу, соцыялістычнае спаборніцтва і, выкарыстоўваючы вопыт работы перадавых раёнаў на хлебазагатоўках, дабіцца хутчэйшага выканання плана загатовак ільнопасення кожным калгасам і кожнай аднаасобнай гаспадаркай.

Вялікія і адказныя задачы стаяць перад раённымі партыйнымі і совецкімі арганізацыямі і спажывецкай кааперацыяй вобласці ў справе арганізацыі первічнай апрацоўкі ільну і здачы высокакаяснага валакна дзяржаве. Тэрміны вылежкі і мочкі ільнасаломкі праходзяць. У радзе месц ужо прыступілі да пад'ёму трасты са сцеліш і арганізавалі апрацоўку ільну і здачу валакна дзяржаве.

Спажывецкая кааперацыя Сямяніцкага раёна загатовіла 693 кілограмы ільновалакна, Брэсцкага раёна — 238 кілограмаў, Гайнаўскага — 100 кілограмаў. Такія тэмпы паступлення ільну з'яўляюцца яўна нездавальняючымі. План ільнозагатовак па вобласці выканан усяго на... 1 процант. Кіраўнікі райспажыўсаюзаў гэтаму ўчастку важнейшай работы не надаюць належнай большэвіцкай увагі, а ў абласным спажывецкім саюзе зусім не турбуюцца аб тым, што выкананне плана загатовак ільну зусім зрываецца і не праяўляюць належнай ініцыятывы, каб паўсямесна арганізаваць первічную апрацоўку ільну і масавую здачу валакна дзяржаве.

— Масавага паступлення ільновалакна мы чакаем у студзені і лютым 1941 года, — заяўляе намеснік старшыні праўлення облспажыўсаюза па загатоўках тав. Заруба.

Зразумела, што ад такога кіраўніка, які жыве адталымі думкамі і займаецца па сутнасці справы апартуністычнымі разважаннямі, нельга чакаць большэвіцкага стылю кіраўніцтва падначаленымі яму арганізацыямі.

Зусім нецярпіма і тое, што абласны замельны аддзел самаўхіліўся ад работы па кіраўніцтву первічнай апрацоўкі ільну і здачай валакна дзяржаве. Тут не ведаюць сапраўднага становішча на месцах, згубілі ўсякую жывую і аператыўную сувязь з раёнамі, не аказваюць ім практычнай дапамогі ў рабоце. А гэта ні ў якім разе не дапушчальна. І начальнік абласнога замельнага аддзела тав. Радкевіч і старшыня праўлення абласнога спажывецкага саюза тав. Трускін павінны пакончыць з недаацэнкай ільну і карэнным чынам перабудаваць сваю работу па кіраўніцтву загатоўкамі ільнопрадукцыі.

Лен, як каштоўнейшая тэхнічная культура і выдатная сыравіна для нашай соцыялістычнай прамысловасці, заслугоўвае таго, каб аб ім праяўлялі гаспадарскія і любоўныя клопаты. Нельга мірыцца з тым, калі кіраўнікі асобных раённых партыйных і совецкіх арганізацый, захапіўшыся іншымі работамі зусім забываюць аб ільне. Яны схільны меркаваць аб сваёй рабоце па таму, як яны спраўляюцца з выкананнем загатовак хлеба і бульбы, скідываючы пры гэтым з рахунку работу па ільнозагатоўках. Гэта вялікая памылка. Перадавым раёнам можна лічыць толькі той раён, які забяспечвае акуратнае выкананне планаў загатовак усіх відаў сельскагаспадарчых прадуктаў і сыравіны.

Задача партыйных і совецкіх арганізацый раёнаў і ўсіх работнікаў спажывецкай кааперацыі вобласці даіцца рэзкага палепшання работы па загатоўцы ільнопасення, шырока разгарнуць первічную апрацоўку ільну і масавую здачу валакна дзяржаве. Кантрактацыйныя дагаворы па здачы ільнопрадукцыі дзяржаве павінны быць выкананы своечасова і поўнасцю кожнай гаспадаркай!

Вялікаму святу дастойную сустрэчу

(Ад нашага карэспандэнта)

Набліжаецца знамянальны дзень — 23 гадавіна Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэвалюцыі. Падрыхтоўку да гэтага свята калектыў рабочых і служачых Гайнаўскай лясной вузкакалейнай чыгункі адзначае новым уздымам соцыялістычнага спаборніцтва, шырокім разгортваннем стаханаўскага руху.

Машыністы, кандуктары, грузчыкі і іншыя рабочыя бяруць на сябе абавязацельствы сустрэць слаўную гадавіну павышэннем прадукцыйнасці працы і паляпшэннем усёй работы чыгункі.

Кожны дзень з участкаў чыгункі паступаюць паведамленні аб новых вытворчых перамогах. Машыністы Гушчын, Клімовіч, Оцепанюк выконваюць вытворчы план на 280—330 процантаў. Гэтых поспехаў яны дабіліся таму, што сталі вадзіць цяжкавагавыя паязды, скарацілі лік прабегу саставаў паражняка, павялічылі нагрузку на кожны вагон. Так, машыніст тав. Гушчын возіць паязды з нагрузкай 150 — 180 кубаметраў пры норме 80 кубаметраў. Ён зусім ліквідаваў халастыя прабегі паражняка. За верасень Гушчын выканаў вытворчы план на 357 процантаў.

Кандуктары Янцевіч, Каўцюк і іншыя на працягу апошніх дзён выконваюць план на 250—270 процантаў. Па ўдарнаму працуюць грузчыкі Цыркунаў, Безік, Пракапюк, Лунашкевіч К., Лунашкевіч В. Пры дзённым плане нагрузкі 10 кубаметраў яны грузяць па 20—25 кубаметраў у дзень.

Вераснёўскі план вузкакалейнай чыгунка выканала на 106 процантаў. Зараз увесь калектыў чыгункі змагаецца за датэрміновае выкананне кастрычніцкага плана.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Аб прысваенні Маскоўскаму станкаінструментальнаму інстытуту імені таварыша І. В. Сталіна

У азнаменаванне 10-годдзя Маскоўскага станкаінструментальнага інстытута задаволіць просьбу студэнтаў, выкладчыкаў, адміністрацыйна-тэхнічных работнікаў і Народнага Камісарыята цяжкага машынабудаўніцтва і прысвоіць інстытуту імя таварыша І. В. Сталіна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН

Масква, Крэмль, 11 кастрычніка 1940 года

Аб справаздачах і выбарах фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў

Пастанова прэзідыума ВЦСПС

1. У сувязі са сканчэннем тэрміна поўнамоцтваў фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў, правесці ў кастрычніку — лістападзе 1940 года справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў, а таксама цэхавых камітэтаў і арганізатараў профсаюзных груп (профгрупоргаў).

2. Справаздачы і выбары фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў профсаюзаў павінны быць праведзены пад знакам мабілізацыі шырокіх мас членаў профсаюзаў на далейшае ўмацаванне гаспадарчай і абаронай магутнасці Совецкага Саюза, разгортванне соцыялістычнага спаборніцтва і стаханаўскага руху, далейшы рост прадукцыйнасці працы і ўмацаванне соцыялістычнай працоўнай дысцыпліны, на барацьбу за ліквідацыю прагулаў і самавольнага ўходу рабочых і служачых з прадпрыемстваў і ўстаноў.

3. Абавязаць профсаюзныя органы забяспечыць на справаздачна-выбарных сходах разгортванне большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі, ускрыццё і знішчэнне недахопаў, якія ёсць у рабоце профсаюзных органаў, і вылучэнне ў састаў фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў лепшых людзей рабочага класа і совецкай інтэлігенцыі, адданых справе партыі Леніна-Сталіна, здольных на аснове рашэнняў X пленума ВЦСПС быстра знішчыць недахопы ў профсаюзным апараце і палепшыць работу профсаюзных органаў.

4. Устанавіць, што справаздачы і выбары цэхавых камітэтаў профгрупоргаў на прадпрыемстве, установе павінны пачацца не пазней чым праз 5 дзён пасля сканчэння выбараў фабрычнага, заводскага або мясцовага камітэта.

5. Прапанаваць профсаюзным органам праводзіць справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў у нерабочы час па зменах і не дапускаць падмены занятых на рабоце за лік працуючых у другіх зменах.

6. Зацвердзіць тэрміны правядзення справаздач і выбараў фабрычных, заводскіх і мясцовых камітэтаў па профсаюзах.

7. Зацвердзіць „Інструкцыю аб правядзенні выбараў профсаюзных органаў".

8. Зацвердзіць формы аператыўнай справаздачнасці аб справаздачах і выбарах фабрычных, заводскіх, мясцовых і цэхавых камітэтаў і профгрупоргаў.

9. Прапанаваць рэдакцыі газеты „Труд", фабрычна-заводскім шматтыражкам і ўсім органам профсаюзнага друку шырока асвятляць справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх, мясцовых і цэхавых камітэтаў і профгрупоргаў.

* *
*

Спецыяльная інструкцыя, зацверджаная прэзідыумам ВЦСПС, устанаўлівае парадак правядзення выбараў профсаюзных органаў.

Выбары профсаюзных органаў праводзяцца закрытым (тайным) галасаваннем. Тайным галасаваннем выбіраюцца фабрычна-заводскія і мясцовыя камітэты, цэхавыя камітэты, арганізатары профсаюзных груп (профгрупоргі), дэлегаты на канферэнцыі і з'езды профсаюзаў, раённыя, гарадскія, абласныя, краёвыя, рэспубліканскія і цэнтральныя камітэты профсаюзаў, рэвізійныя камісіі.

Галасаванне спісам забараняецца. Галасаванне павінна праводзіцца па асобных кандыдатурах, пры чым усім членам профсаюзаў забяспечваецца неабмежаваная права адводу і крытыкі кандыдатаў.

Справаздачы і выбары фабрычна-заводскіх і мясцовых камітэтаў праводзяцца ў нерабочы час на агульных сходах членаў профсаюзаў прадпрыемстваў, устаноў, навучальных устаноў. У асобных выпадках, з дазволу цэнтральных камітэтаў саюзаў, справаздачы і выбары могуць праводзіцца на зменных або цэхавых сходах.

Там, дзе выбары фабрычна-заводскага камітэта праводзяцца на зменных або цэхавых сходах, пасля абмеркавання справаздачы выбіраюцца адкрытым галасаваннем даверэныя асобы (адзін даверэны ад 25 — 50 членаў саюза). Нарада даверэных папярэдне намячае кандыдатуры ў састаў фабрычна-заводскага камітэта. Гэтыя кандыдатуры ад імені нарады вылучаюцца на цэхавых або зменных сходах і абмяркоўваюцца персанальна. Кандыдатуры, вылучаныя па якім-небудзь сходзе апрача прапанаваных нарадай даверэных, павінны абмяркоўвацца на ўсіх наступных зменных, цэхавых сходах, і ў спісі для тайнага галасавання ўключаюцца толькі кандыдатуры тых, якіх рэкамендуе не менш палавіны членаў профсаюза, працуючых на прадпрыемстве.

Сходы лічацца правамоцнымі ў тым выпадку, калі на іх прысутнічае не менш двух трэцей наяўнага састава членаў профсаюза, працуючых на прадпрыемстве або ва ўстанове ў перыяд выбараў (за выключэннем хворых, адпусчыкоў, знаходзячыхся ў камандыроўках і т. д.).

Абмеркаванне ўсіх кандыдатур вядзецца ў тым парадку, як яны былі запісаны — па меры іх паступлення ў прэзідыум сходу, канферэнцыі, з'езда. Кожны ўдзельнік сходу можа адвесці любую колькасць кандыдатаў. Па кожнай кандыдатуры можа выказвацца „за" і „супроць" неабмежаваная колькасць членаў профсаюзаў.

Выбранымі ў састаў профсаюзнага органа лічацца кандыдаты, атрымаўшыя большасць галасоў у адносінах да астатніх кандыдатур і больш палавіны галасоў прысутнічаўшых на сходзе членаў саюза або дэлегатаў канферэнцыі, з'езда.

Поўнасцю інструкцыя аб правядзенні выбараў профсаюзных органаў апублікавана 9 кастрычніка ў газеце „Труд".

Здача норм на значок ПРХА

Уключыўшыся ў соцыялістычнае спаборніцтва за дастойную сустрэчу ўсенароднага свята XXIII гадавіны Вялікай Кастрычніцкай рэвалюцыі студэнты педагагічнага вучылішча І і II курсаў узялі на сябе абавязацельства здаць нормы на значок ПРХА да дня свята.

Узятае абавязацельства некаторыя студэнты выканалі датэрмінова. Падвучылішча ўжо мае першых 41 чалавека значкістаў ПРХА. Сярод здаўшых нормы на значок — 12 дзяўчат.

Зараз да здачы норм рыхтуецца яшчэ 40 чалавек, якія атрымаюць значкі ў дзень вялікага свята.

Студэнты, здаўшыя нормы на значок ПРХА першай ступені, рыхтуюцца стаць інструктарамі ПРХА.

Шабін.

УКАЗ
ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР
Аб узнагароджанні першага Маскоўскага Медыцынскага інстытута ордэнам Леніна

У азнаменаванне 175-гадовага юбілея першага Маскоўскага Медыцынскага інстытута — старэйшай вышэйшай медыцынскай установы і ўлічваючы яго выдатныя заслугі ў галіне развіцця медыцынскай навукі і падрыхтоўкі высокакваліфікаваных дасячоў медыцыны, узнагародзіць першы Маскоўскі Медыцынскі інстытут Ордэнам Леніна.

Старшыня Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР М. КАЛІНІН
Сакратар Прэзідыума Вярхоўнага Совета СССР А. ГОРКІН

Масква, Крэмль, 11 кастрычніка 1940 года

Да падпісання Пагаднення паміж СССР і Фінляндыяй аб дэмілітарызацыі і неўзбраенні Аландскіх астравоў

11 кастрычніка ў Маскве падпісана Пагадненне паміж СССР і Фінляндыяй аб Аландскіх астравах.

З совецкай стараны Пагадненне падпісаў Народны Камісар Замежных Спраў тав. Молатаў В. М. і фінляндскай стараны — паслапнік Фінляндыі ў Маскве п. Паасіківі Ю. К.

Тэкст пагаднення прыводзіцца ніжэй.

Пагадненне СССР і Фінляндыі аб Аландскіх астравах

Урад СССР, з адной стараны, і ўрад Фінляндскай рэспублікі, з другой стараны, натхнёныя жаданнем умацаваць асновы сваёй бяспасны і міру на Балтыйскім моры, прызналі неабходным заключыць паміж сабой наступнае Пагадненне і для гэтага назначылі сваімі ўпаўнаважанымі:

Урад Саюза Совецкіх Соцыялістычных Рэспублік

Старшыню Совета Народных Камісараў і Народнага Камісара Замежных Спраў Вячэслава Міхайлавіча Молатава.

Урад Фінляндскай рэспублікі

Надзвычайнага пасланніка Фінляндыі ў Маскве і Паўнамоцнага Міністра Юхо Кусці Паасіківі, якія ўпаўнаважаныя па прадпаўленні сваіх паўнамоцтваў, прызнаных саставленымі ў належнай форме і ў поўным парадку, згадзіліся аб наступным:

Артыкул 1.

Фінляндыя абавязуецца дэмілітарызаваць Аландскія астравы, не ўмацоўваць іх і не прадастаўляць іх для ўзброеных сіл другіх дзяржаў.

Гэта азначае таксама, што ніякая ўстанова або аперацыйная база, ваенная або марская, ніякая ўстанова або аперацыйная база ваеннай авіяцыі, ніякае іншае ўстройства, якое можа быць выкарыстаным у ваенных мэтах, не можа быць захавана або ствараема ў зоне Аландскіх астравоў, ні Фінляндыяй, так і другімі дзяржавамі, а існуючыя на астравах фундаменты для ўстаноўкі артылерыі павінны быць зрыты.

Артыкул 2.

Пад назвай „Зона Аландскіх астравоў" ў гэтым Пагадненні падразумяваюцца ўсе астравы, астраўкі, шхеры і скалы, размешчаныя ў водным прасторы, які абмяжоўваецца наступнымі лініямі:

а) На поўначы паралеллю паўночнай шыраты 60 градусаў 41 мінута;

б) на ўсходзе прамымі лініямі, злучаючымі паслядоўна наступныя геаграфічныя пункты:

1) 60 градусаў 41,0 мінута паўночнай шыраты і 21 градус 00,0 мінут, усходняя даўжыні ад Грынвіча.

2) 60 градусаў 35,9 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 06,9 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

3) 60 градусаў паўночнай шыраты і 21 градус 08,6 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

4) 60 градусаў 15,8 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 05,5 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

5) 60 градусаў 11,4 мінуты паўночнай шыраты і 21 градус 00,4 мінуты ўсходняй даўжыні ад Грынвіча.

6) 60 градусаў 09,4 мінуты паўночнай шыраты і 21 градус 01,2 мінуты ўсходняй даўжыні ад Грынвіча.

7) 60 градусаў 05,5 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 04,3 мінуты усходняй даўжыні ад Грынвіча.

8) 60 градусаў 01,1 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 11,3 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

9) 59 градусаў 59,0 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 08,3 мін. усходняй даўжыні ад Грынвіча.

10) 59 градусаў 53,0 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 20,0 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

11) 59 градусаў 48,5 мінут паўночнай шыраты і 21 градус 20,0 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

12) 59 градусаў 27,0 мінут паўночнай шыраты і 20 градусаў 46,3 мінуты ўсходняй даўжыні ад Грынвіча.

в) На поўдні паралеллю паўночнай шыраты 59 градусаў 27 мінут.

г) па захадзе прамымі лініямі, злучаючымі паслядоўна геаграфічныя пункты:

13) 59 градусаў 27,0 мінут паўночнай шыраты і 20 градусаў 09,7 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

14) 59 градусаў 47,8 мінут паўночнай шыраты і 19 градусаў 40,0 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

15) 60 градусаў 11,8 мінут паўночнай шыраты і 19 градусаў 05,5 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

16) Сярэдзіна скалы Меркет 60 градусаў 18,4 мінуты паўночнай шыраты і 19 градусаў 08,5 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

17) 60 градусаў 41,0 мінут паўночнай шыраты 19 градусаў 14,4 мінут усходняй даўжыні ад Грынвіча.

Тэрытарыяльныя воды Аландскіх астравоў лічацца распасціраючымися ў час адліва на адлегласць у тры марскіх мілі ад астравоў, астраўкоў і скал, якія не знаходзяцца пастаянна пад вадой, размежаваных вышэй.

Артыкул 3.

Совецкаму Саюзу прадастаўляецца права ўтрымліваць на Аландскіх астравах сваё консульства, у кампетэнцыю якога, акрамя звычайных консульскіх функцый, уваходзіць праверка правядзення ў жыццё абавязацельстваў па артыкулу 1 гэтага Пагаднення аб дэмілітарызацыі і неўмацаванні Аландскіх астравоў.

У тых выпадках, калі консульскі прадстаўнік СССР установіць акалічнасці, якія па яго думцы знаходзяцца ў супярэчнасці з мяючыміся ў гэтым пагадненні пастановамі аб дэмілітарызацыі і неўмацаванні Аландскіх астравоў, ён мае права зрабіць, праз упраўленне Ландогеўдзінга Аландскага лена, фінляндскім уладам заяву аб вытварэнні сумеснага расследвання.

Гэта расследванне робіцца консульскім прадстаўніком СССР і ўпаўнаважаным урада Фінляндыі ў самым тэрміновым парадку.

Рэзультаты сумеснага расследвання фіксіруюцца ў пратаколе, саставленым у 4 экземплярах, на рускай і фінскай мове, і паведамляюцца, для прыняцця неабходных мер, урадам абоіх дагаворваючыхся старон.

Артыкул 4.

Гэтае Пагадненне ўступае ў сілу неадкладна пасля яго падпісання і падлягае наступнай ратыфікацыі.

Абмен ратыфікацыйнымі граматамі будзе зроблен у гор. Хельсінкі ў 10-дзённы тэрмін.

Саставлена ў двух арыгіналах, кожны на рускай і фінскай мовах у гор. Маскве 11 кастрычніка 1940 года.

В. Молатаў. Ю. К. Паасіківі.

Аб лампах, сцёклах і фіцілях

Гэта пытанне, як ніколі, зараз хвалюе жыхароў горада Брэста і сельскіх мясцовасцей.

У Брэсце электрастанцыя часова спыніла падачу электрычнасці ў прыватныя кватэры ў сувязі з астаноўкай на рамонт. Для многіх жыхароў гэта было нечаканасцю. Аб адсутнасці электрычнага святла ім стала вядома толькі тады, калі яны павярнулі выключацелі і лампачкі не загарэліся.

Назаўтра ля пасуднага магазіна горхарчпромгандля № 71, што знаходзіцца па Маскоўскай вуліцы, яшчэ досвіткам стварылася вялікая черга. У магазіне, у якім па думцы пакупнікоў павінны былі быць лампы, такавых ва аказалася.

Прадаўцы ветліва прапаноўвалі пакупнікам рэзервуары ад лампаў і сцёклы 5 і 14 нумароў.

— А фіцілі ў вас ёсць? — настойліва перапытвае адзін з пакупнікоў.

— Няма, — адказвае прадаўшчык.

— Можа быць машынкі ёсць?

— Што вы не бачыце, — разлаваўшыся адказаў прадавец. Тавар на паліцах, хочаце купляйце, а не хочаце дык ідзіце, не перашкаджайце іншым, тут не бюро даведак.

Але-ж усё такі пакупніку патрэбна была лампа, ён быў неўгамонны і працягваў у такім-жа ветлівым тоне, не гледзячы на грубасць прадаўца.

— Апошняе пытанне: ці ёсць яшчэ пасудныя магазіны ў горадзе?

— Няма, — сярдзіта адказаў прадавец. Калі хочаце па базары можаце дастаць лампу.

І праўда, падумаў пакупнік, базар недалёка...

На базары было некалькі лямп. І так, як яны былі ў гэтыя дні ў модзе, то цана на іх была казачна высокая. За старую лампу пра сілі... 25 рублёў.

... Лампу, шкло, фіціль не знойдзеш днём з агнём і ў магазінах сельскай спажывецкай кааперацыі. Мы былі ў Вялікарыцкім сельпо. Загадчык базы сельпо нам расказаў, што на працягу апошніх месяцаў сельпо не атрымала ні адзінай лампы, ні аднаго шкла, а попыт на гэтыя неабходныя тавары вельмі вялікі. У вёсках пачалі працаваць вечарнія школы, але іх работу тармозіць недахоп ламп. Зачастую многія школьнікаў не маюць магчымасці падрыхтаваць урокі з-за адсутнасці лампавага шкла, фіціля, лампы.

Арганізаваць перавораванне бульбянішча

Калгаснікі і адноасобнікі нашай вобласці ў гэтым годзе атрымалі высокі ўраджай бульбы. У сярэднім ураджай у калгасах дасягае 180—200 центнераў з гектара.

Ва ўсю шыр разгорнута масавая ўборка бульбы. Перадавыя калгасы сумесна з уборкай выконваюць бульбапастаўку.

Зараз задача заключаецца ў тым, каб у часе ўборкі ні адной бульбіны не засталася ў зямлі, умела забуртаваць насенныя і стратавыя фонды, добраякасна захаваць іх ад дажджоў і марозаў.

З вопыту работы калгасаў усходніх абласцей БССР вядома, што кожны гектар пасля перавораванне дае не менш 8 центнераў бульбы. Зборам начыста ўсёй бульбы калгаснікі змогуць павялічыць вагу сваіх прадуктаў.

У вобласці пакуль што не практыкуецца гэтае каштоўнае мерапрыемства. Намеснік загадчыка абласнога земельнага аддзела тав. Крапіўка на пытанне як абстаіць справа з перавораваннем бульбы ў калгасах прама адказаў: гэта не прадугледжана справаздачнасцю райза, у зводках не адлюстравана, яму цяжка адказаць на гэта пытанне.

Райземаддзелам трэба ўзяць справу перавораванне бульбы ў свае рукі і тады яна будзе забяспечана.

Абавязацельствы медыцынскіх работнікаў

У Дамачэўскім раёне адным з адсталых участкаў абаронна-масавай работы з'яўляецца санітарная работа. За ўвесь перыяд арганізавана толькі 17 первічных арганізацый Чырвонага крыжа, з агулным членствам 280 чалавек. Падрыхтавана значкістаў „Гатоў да санітарнай абароны" усяго 50 чалавек.

Да гэтага часу райком Чырвонага крыжа не ўцягнуў у актыўную санітарнаабаронную работу медыцынскіх работнікаў. Толькі тав. Свірыд (сакратар комсамольскай арганізацыі райздраўаддзела) актыўна ўдзельнічае ў рабоце таварыства Чырвонага крыжа і на працягу кароткага тэрміна падрыхтавала 35 значкістаў ГСА першай ступені. Аднак, тав. Свірыд нічога не зрабіла, каб у гэту работу ўцягнуць усіх комсамольцаў медыцынскіх работнікаў.

9 кастрычніка на раённай нарадзе работнікаў аховы здароўя быў абмеркаван заклік урачоў і медыцынскіх работнікаў горада Масквы да ўсіх медыцынскіх работнікаў і ўрачоў БССР аб актыўным удзеле ў санітарна-абаронным рабоце.

Удзельнікі нарады ўключыліся ў соцыялістычнае спаборніцтва і ўзялі абавязацельствы: стварыць первічныя арганізацыі Чырвонага крыжа на ўсіх прадпрыемствах, арцелях, установах, школах і населеных пунктах раёна і праводзіць санітарную работу пад лозунгам ні аднаго члена таварыства „Чырвонага крыжа" без значка ГСА.

Кожны медыцынскі работнік абавязаўся да канца 1940 года падрыхтаваць не менш 50 значкістаў ГСА першай ступені. На прадпрыемствах, у арцелях і ва ўстановах стварыць і падрыхтаваць санітарныя пасты.

На спаборніцтва па санітарна-абаронным рабоце ўдзельнікі нарады выклікалі медыцынскіх работнікаў Высокаўскага раёна. Задача райкома Чырвонага крыжа разам з комсамольскай арганізацыяй райздраўаддзела наладзіць кантроль за выкананнем узятых абавязацельстваў.

С. Фёдараў.

У САЮЗЕ СОВЕЦКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

9 кастрычніка ў Доме пісьменніка адбыўся агульны сход крытыкаў. З дакладам аб становішчы літаратурнай крытыкі, задачах секцыі крытыкаў выступіў тав. Клімовіч.

У абмеркаванні даклада прынялі ўдзел пісьменнікі В. Бахчылева (Масква), М. Лынькоў і крытыкі Г. Бярозкін, А. Кучар, Ю. Дворкіна, М. Ларчанка, М. Модзель і Я. Шарахоўскі.

Дакладчык і выступаўшыя ў спрэчках адзначылі творчы рост беларускай літаратурнай крытыкі, якая за дзела разам з інстытутам літаратуры Акадэміі Навук БССР падрыхтаваць нарысы па гісторыі беларускай літаратуры.

На сходзе было ўказана на недастатковы прынцыповы і тэарэтычны ўзровень дыскусіі па пытанню паэзіі, якая вядзецца на старонках газеты „Літаратура і мастацтва". У крытыкаў яшчэ часам не хапае смеласці прама і адкрыта гаварыць аб недахопах у творах паасобных пісьменнікаў.

На сходзе было выбрана новае бюро секцыі ў саставе тт. М. Клімовіча, Г. Бярозкіна і Ю. Дворкіна. (БЕЛТА).

Стаханаўка Гомельскай трыкатажнай фабрыкі імені 8 сакавіка актыўная грамадзянка Т. Н. Нейцава, уключыўшыся ў прадкастрычніцкае спаборніцтва выконвае норму на 136 проц.

Нова-Барысаўская гончарна-керамічная прамарцель „Чырвоны Кастрычнік" (Мінскай вобласці) выпускае розныя мастацкія вырабы. Лепшыя узоры работы арцелі экспанаваліся на Парыжскай выстаўцы. На здымку: майстра-мадэльшчык М. Е. Крываротаў за адборам мастацкіх вырабаў для Усебеларускай выстаўкі — Леніна і Сталіна арганізатары Беларускай дзяржаўнасці. Фота І. Шышко.

„Седоўская бібліятэка"

У выдавецтве Галоўнага Упраўлення Паўночнага морскога шляху выпускаецца „Седоўская бібліятэка". Яна складаць з кніг мемуарнага характару (дзённікі, запіскі, успаміны седоўцаў) і навуковых матэрыялаў — „Труды экспедиции на ледокольном пароходе „Георгий Седов".

У бліжэйшы час выходзяць з друку 2 кнігі: „На караблі „Георгій Седоў" праз Ледавіты акіян" — карабельныя запіскі капітана дальняга плавання К. С. Бадыгіна і зборнік „Расказы седоўцаў", у якім змешчаны нарысы пятнаццаці Герояў Совецкага Саюза, якія зрабілі выдатнае плаванне на „Седове". У гэтай-жа серыі намечана выданне дзённіка навуковага супрацоўніка экспедыцыі В. Х. Буйніцкага.

У арктычным навукова-даследчым інстытуце апрацоўваюцца навуковыя матэрыялы, сабраныя седоўцамі за 812 дзён дрэйфа. Яны выйдуць у спецыяльным чатырохтомным выданні — „Труды экспедиции", якія абагульняюць навуковыя вазіранні па астрэаноміі, гравітацыі, палярным зяянні, метэралогіі, гідралогіі, рэжыму і дрэйфу ільдоў, марскіх цячэннях, гідрабіялогіі і другіх.

(ТАСС).

Больш увагі дзіцячым садам

Партыя і совецкі ўрад удзяляюць вялікую ўвагу справе выхавання падрастаючага пакалення. Дзеці нашай краіны з дашкольнага ўзросту атрымліваюць грамадскае выхаванне ў дзяржаўных выхаваўчых установах, пачынаючы ад яслей і канчаючы ўніверсітэтамі.

Па ўсёй краіне разгорнута шырокая сетка дашкольных устаноў. Многа сродкаў адпусціла дзяржава для арганізацыі дзіцячых садоў у заходніх абласцях БССР. У гэтым можна ўпэўніцца на вопыце нашай вобласці. За выключэннем Жабінкаўскага і Бярозаўскага, ва ўсіх раёнах ёсць дзіцячыя сады. Усяго па вобласці 26 дзіцячых садоў, якімі ахоплена 1250 дзяцей.

Аднак там, дзе ёсць дзіцячыя сады, работа іх далёка не наладжана. Гэтаму ёсць прычыны. (Па-першае, работа дзіцячага саду залежыць ад паваротлівасці і арганізацыйных здольнасцей яго кіраўнікоў і, па-другое, ад дапамогі і стварэння ўмоў для работы з боку раённых арганізацый.

Я застанаўлюся на другой прычыне. Некаторыя старшыні райвыканкомаў і горвыканкомаў мала клапоцяцца аб стварэнні ўмоў для работы дашкольных устаноў. У Кляшчэльскім і Высокаўскім раёнах дзіцячыя сады туляцца ў непрыстасаваных памяшканнях. Тут не скарыстоўваюцца сродкі, адпушчаныя на рамонт і прыстасаванне памяшканняў.

Амаль ва ўсіх дзіцячых садах не хапае неабходнага абсталявання, цацак, літаратуры і іншых дапаможнікаў. А сродкаў і для гэтай мэты адпушчана дастаткова. З-за адсутнасці ложкаў у Сямяцкім, Высокаўскім і Гайнаўскім дзіцячых садах не выконваецца такі важны рэжымны момант, як пасляабедзенны сон дзяцей.

Мне прышлося гутарыць з першым сакратаром Высокаўскага райкома КП(б)Б тав. Рабцавым па пытанню забеспячэння дзіцячага сада лепшым памяшканнем. Ён мне прама адказаў: „Н[illegible] знайду памяшканне". [illegible] памяшканне было ў Вы[illegible], але тады дзіцячы сад р[illegible] па суседству з кватэ[illegible]ра райкома і, відаць, [illegible] немна мець такога п[illegible]нага суседа.

Дзеле[illegible] С. П.,
загадчык Брэсцк[illegible] абласным дашкольным мет[illegible] кабінетам.

Дзмітрый Іванавіч Пісараў

(Да стагоддзя з дня нараджэння)

Росквіт рускай літаратурнай крытыкі быў звязан з паяўленнем на грамадскай арэне ідэолагаў растучай рэвалюцыйнай дэмакратыі. Белінскі, Герцэн, Чарнышэўскі і Добралюбаў ператварылі крытыку ў магутны сродак эстэтычнага і палітычнага выхавання мас. Яны накіравалі асноўны паток рускай класічнай літаратуры ў русло рэалізма.

Да гэтай-жа слаўнай плеяды належаў і Дзмітрый Іванавіч Пісараў, вядомы рускі крытык і публіцыст, пачаўшы і закончыўшы сваю дзейнасць у 60-х гадах мінулага веку.

Шасцідзесятыя годы — вельмі важная эпоха ў гісторыі грамадскага руху ў Расіі. Паражэнне царызма ў Крымскай вайне 1855 года паказала ўсім, што самаўладства і прыгоннічтва перажылі саміх сябе і ператварыліся ў галоўнейшую перашкоду для развіцця краіны. Сам урад вымушан быў са страху перад рэвалюцыяй стаць на шлях рэформ, з якіх галоўнейшай было „вызваленне" сялян ад прыгоннай залежнасці. Аднак самаўладства, прыступіўшы да рэформ, зусім не думала аб задавальненні народных патрэб. Мета рэформ складала ў тым, каб невялікімі падачкамі, па магчымасці чыста знешнімі фармальнымі змяненнямі ў старых адносінах, ашукаць незадаволеных, захаваўшы і ў новых умовах некранутымі самаўладства і прывілегіраванае становішча дваранства. І пасля сялянскай рэформы ў вёсцы захаваліся ў вялікім маштабе прыгонніцкія перажыткі, пануючае становішча памешчыкаў.

У сялянства не было тады сіл, каб скінуць самаўладства і памешчыкаў рэвалюцыйным шляхам. Пролетарыят у Расіі шасцідзесятых гадоў знаходзіўся яшчэ на самых першапачатковых ступенях свайго развіцця. Сялянства, не кіруемае рэвалюцыйным класам з горада, забітае вякамі работва, яшчэ не ўладаючае палітычным сазнаннем і таму не разбіраўшаеся дастаткова ясна ў сваім становішчы, хвалявалася, але не пайшло далей адзінкавых, раздробленых паўстанняў і бунтоў. Аднак, указвае Ленін, „былі і тады ўжо ў Расіі рэвалюцыянеры, стаўшыя на баку сялянства і разумеўшыя ўсю вузасць, усё ўбоства праславутай „сялянскай рэформы", увесь яе прыгонніцкі характар. На чале гэтых, крайне нешматлікіх тады, рэвалюцыянераў стаяў Н. Г. Чарнышэўскі" (Ленін, том XV, стар. 143).

Гэтыя рэвалюцыянеры хацелі знішчыць самаўладства, адняць зямлю ў памешчыкаў, ператварыць Расію ў карысць народа, сялян, дэмакратычных нізоў. Урад Александра II люта распраўляўся з лепшымі прадстаўнікамі мыслячай Расіі. У 1862 годзе ён арыштаваў Чарнышэўскага і рад яго саратнікаў. Лепшыя журналы эпохі „Современник" і „Русское слово" былі закрыты. Сярод падвергшыхся праследванням з боку царызма быў Д. І. Пісараў, малады публіцыст і крытык.

Заключаны ў Петрапаўлаўскую крэпасць, Пісараў прадаўжаў сваю літаратурную дзейнасць. З велізарнай сілай гучэў яго голас з сцен царскага каземата. Кожны новы яго артыкул усё з большай сілай заклікаў да праўды і справядлівасці.

У гэтыя годы, калі руская літаратура ўжо страціла Добралюбава, калі царызм затачыў Чарнышэўскага і прымусіў яго маўчаць, Пісараў граміў мракабесаў і рэакцыянераў, заняўшы першае месца ў перадавой рускай публіцыстыцы і крытыцы.

Д. І. Пісараў нарадзіўся 14(2) кастрычніка 1840 года, у сяле Знаменскім, Орлоўскай губерні. Ён вучыўся ў адной з пецярбургскіх гімназій, пасля сканчэння якой у 1856 годзе паступіў у Пецярбурскі універсітэт на гісторыка-філалагічны факультэт. Пачатак літаратурнай дзейнасці Пісарава адносіцца да 1858 года, калі ён стаў супрацоўнічаць у бібліяграфічным аддзеле „Рассвета", „журнала для дарослых дзяўчат". Зразумела, што растучаму і мацнеючаму публіцыстычнаму дараванню Пісарава рамкі „Рассвета" вельмі хутка аказаліся цеснымі. Па сканчэнню ўніверсітэта Пісараў стаў пастаянным супрацоўнікам журнала „Русское слово". Дзякуючы Пісараву „Русское слово" ператварылася ў адзін з самых перадавых, папулярнейшых рускіх журналаў.

Калі царскі ўрад прыпыніў выхад „Русского слова", Пісараў напісаў для падпольнай друкарні студента Балода разбор пасквіляў супроць Герцэна, аўтарам якіх быў наёмны агент царскага ўрада барон Фірко. Артыкул Пісарава быў сапраўдным рэвалюцыйным праклямацыяй. Ён прама заклікаў да гвалтоўнага звяржэння самаўладства. „Звяржэнне пануючай царскай дынастыі Раманавых, — пісаў Пісараў, — і змяненне палітычнага і грамадскага ладу саставляюць адзіную мету і надзею ўсіх чесных грамадзян. Каб пры цяперашнім становішчы спраў не жадаць рэвалюцыі, трэба быць або зусім абмежаваным, або зусім падкупленым у карысць пануючага зла".

Па філасофскіх сваіх перакананнях Пісараў быў матэрыялістам. Але калі Чарнышэўскі быў паслядоўнікам Фейербаха, то Пісараў з'яўляўся паслядоўнікам Бюхнера, Фохта і Малешота. Фейербах быў адным з папярэднікаў марксізма, Бюхнер, Фохт і Малешот былі матэрыялістамі-эмпірыкамі, для якіх апісанне натуральна-навуковых з'яў мела большае значэнне, чым іх тэарэтычнае растлумачэнне. Матэрыялізм Пісарава па свайму ўзроўню быў ніжэй, чым матэрыялізм Чарнышэўскага. Але гэта не перашкодзіла яму адыграць вялікую станоўчую ролю ў барацьбе з ідэалістычнай рэакцыяй, у прапагандзе прыродазнаўчых навук.

Прапаганда карысці прыродазнаўства — адна з самых характэрных асаблівасцей публіцыстычнай дзейнасці Пісарава. Пісараў даказваў, што дзякуючы прыродазнаўству чалавек авалодвае тайнамі прыроды і становіцца гаспадаром над яе сіламі. „Весялей жыць, лягчэй дышаць, — пісаў ён, — калі замест здагадкаў і абстрактнасцей бачыш асязальныя з'явы і ўсведамляеш як сваю залежнасць ад іх, так і сваё панаванне над імі".

Настойлівая і захапляючая прапаганда карысці прыродазнаўчых навук Пісаравым прынесла багатыя рэзультаты. Ён многа садзейнічаў распаўсюджванню ў Расіі вучэння Дарвіна. Пад уплывам яго артыкулаў у юнацкія годы сталі захапляцца прыродазнаўчымі навукамі сусветна-вядомыя рускія вучоныя — фізіёлаг І. П. Паўлаў і хімік А. Н. Бах.

Дзейнасць Пісарава як літаратурнага крытыка вызначалася яго соцыяльна-палітычнымі і філасофскімі поглядамі. Эстэтыка Пісарава насіла матэрыялістычны характар. Яна была прасякнута гістарызмам. Пісараў вёў упартую барацьбу супроць абстрактнага антыгістарычнага ідэалізма ў пытаннях літаратуры і мастацтва. Ён даказваў, што вечных, незменных законаў прыгожага не існуе, што законы мастацтва творацца і выцякаюць з сапраўднага жыцця. Як прыхільнік грамадскага назначэння літаратуры Пісараў лічыў змест мастацкага твору больш істотным, чым яго форму. Ён даказваў, што форма мае значэнне як спосаб выражэння зместу. „Мне здаецца, што ў вершах як і ў прозе, перш усяго патрэбна думка" — пісаў ён.

У сваіх артыкулах Пісараў падвяргаў крытычнаму разбору творы Пісемскага, Тургенева, Гончарова, Гейне, Шчэдрына, Дастаеўскага, Талстога, Пушкіна. Як вядома, Пісараў адмаўляў значэнне творчасці Пушкіна, спрабаваў даказаць, што мастацтва бескарысна для грамадскага жыцця. Пісараў памыляўся, але памылка яго тлумачыцца ўмовамі грамадскай барацьбы таго часу.

Лібералы абаранялі лозунг чыстага мастацтва. У якасці доказу незалежнасці мастацтва ад злобы дня, ад палітыкі яны прыводзілі творчасць Пушкіна. Біяграфія Пушкіна ў часы Пісарава яшчэ не была як след вывучана. Непасрэдна рэвалюцыйныя месцы ў творах Пушкіна былі цэзурай забаронены і скрыты ад даследчыкаў і чытачоў. Пагэтаму Пісараў, каб абвергнуць сваіх праціўнікаў — лібералаў, прыхільнікаў мастацтва для мастацтва, стаў зусім адмаўляць значэнне Пушкіна. Пісараў быў не праў, але яшчэ больш не правы былі тыя ілжывыя гісторыкі, якія ператваралі Пушкіна быццам-бы ў пакорнага слугу цара.

Пісараў быў глыбока аддан народу і радзіме. Ён марыў аб велічы Расіі як дзяржавы і аб шчаслівым жыцці працоўных мас. Рад яго артыкулаў напісан пад уплывам ідэй утапічнага соцыялізма.

Па сведчанню Н. К. Крупскай, Ленін добра ведаў і любіў творы Пісарава. У артыкуле „Што рабіць?", громячы меншавіцкіх ныцікаў і малавераў, якія не ўяўлялі сабе перамогі рэвалюцыі ў Расіі, Уладзімір Ільіч успамінаў Пісарава, яго думкі аб сувязях паміж марай і сапраўднасцю.

Пісараў памёр у 1868 годзе, калі яму яшчэ не было 28 год. Ён пражыў усяго толькі паўтара года пасля таго, як выйшаў з Петрапаўлаўскай крэпасці.

В. Кірпоцін.

ВОСЕНЬ НА КУРОРТАХ

На поўдні краіны яшчэ стаяць цёплыя сонечныя дні. Пляжы курортаў Крыма і Каўказа запоўнены адпачываючымі. Але і тут ужо адчуваецца дыханне восені. Усё часцей дуюць ветры з мора, усё халаднейшае становішча раніцой.

Курорты пачалі падрыхтоўку да восені. За лета праароблена значная работа па палепшанню лячэбнай справы. Многія здраўніцы спецыялізаваны. Пасля рэканструкцыі адкрыт прадназначаны для траўматычных хворых санаторый № 5 у Старай Мацесце, перааблаканы для астматыкаў санаторый імені К. Маркса ў Кіславодску. Пры некаторых здраўніцах адкрыты спецыялізаваныя аддзяленні. Па прыкладу Сочы ў Кіславодску і Жалезнаводску адкрыліся паліклінікі для амбулаторных хворых. Лета адзначалася і вялікімі будаўнічымі работамі. У Сочы — Мацесце ўжо падведзен пад дах будынак новага санаторыя для вучоных, у Старай Мацесце закончана будаўніцтва вялікага ваеннага будынка № 4, здана ў эксплаатацыю новае ванное аддзяленне ў Ісентуках, расшыраны грязелячэбніца і ванны будынак у Жалезнаводску. Палепшана абсталяванне пляжаў, асабліва ў Еўпаторыі, Сочы і Хосце. На многіх курортах гэтым летам праведзена вялікая навуковая работа. У санаторыях паўднёвага берагу Крыма пачата ўжыванне рэнтгенатэрапіі пры туберкулёзе горла і вінаградалячэнне нервова-соматычных хворых.

Праз 5 дзён пачынаецца асенні сезон. Зараз многія санаторыі зачыняюцца. Восенню і зімой яны будуць працаваць з поўнай нагрузкай. Толькі санаторыі паўднёвага берагу Крыма абслужаць 40 000 чалавек. Некаторыя здраўніцы будуць расшыраны. Так, у Цхалтубскім санаторыі і Гагрынскім доме адпачынку профсаюзаў колькасць месц павялічыцца на 135. У Грузіі пераводзіцца на зімовую работу Абастуманскі і Баржомскі санаторыі для курортнікаў, якія будуць адпачываць у асенне-зімовы сезон выдзяляецца 100 месц у Баржомскай гасцініцы.

На Зялёным мысе (Аджарыя) арганізуецца зімовае лячэнне марской вадой. Пачата падрыхтоўка да ацяплення былых пенсіянатаў курорта Друскенікі ў Беластоцкай вобласці. Курорт будзе рэканструіраван. Вырастуць новыя карпусы дамоў адпачынку чыгуначнікаў і работнікаў вышэйшай школы. Днямі на раце Кокшэты адкрываецца зімовы санаторый для дзяцей шахцёраў Караганды.

Курортам дадзены ўказанні забяспечыць восеннюю бесперабойную работу бальнеолагічных устаноў, забяспечыць хворых цёплымі коўдрамі, арганізаваць перавозку курортнікаў у закрытых машынах. На асенне-зімовы сезон распрацоўваюцца праграмы камбініраваных метадаў лячэння, якое будзе праводзіцца ў адпаведнасці з новымі дыферэнцыраванымі тэрмінамі прабывання хворых на курортах. (ТАСС).

ПАРТЫЙНАЕ ЖЫЦЦЁ

У ГАРКОМЕ КП(б)Б

Абучэнне і выхаванне ў школе — неаддзялімы

Бюро Брэсцкага гаркома КП(б)Б на сваім пасяджэнні 10 кастрычніка заслухала і абмеркавала даклад загадчыка горана тав. Барысава аб становішчы выхаваўчай работы ў школах горада.

Першы месяц вучобы паказаў наяўнасць рада сур'ёзных недахопаў у пастаноўцы выхаваўчай работы ў школах.

Асабліва незадавальняючае становішча ў сярэдняй школе № 15 (дырэктар школы комуніст тав. Шабека). У радзе класаў гэтай школы надзвычайна нізкая дысцыпліна сярод вучняў, ёсць факты хуліганскіх выпадаў вучняў старэйшых класаў супроць настаўнікаў. Не гледзячы на тое, што ў школе нядаўна быў зроблен рамонт, ужо зараз у радзе класаў пабіты шыбы ў вокнах, сцены забруджаны і падрапаны.

У школе № 15 ёсць комсамольская арганізацыя, якая налічвае 60 чалавек. Аднак, яна не вядзе барацьбы за паладжванне вучэбна-выхаваўчай работы. Больш таго, асобныя комсамольцы выступаюць у ролі дэзарганізатараў. Не гледзячы на тое, што ў школе ёсць комсорг ЦК ВЛКСМ і піонерработнік, работа з піонерамі зусім неарганізавана.

Недысцыплінаванымі паказваюць сябе дзеці-вучні некаторых кіруючых работнікаў. Бацькі-комуністы не прымаюць удзелу ў рабоце школы.

Яўна нездавальняюча пастаўлена выхаваўчая работа і ў радзе іншых школ (школа № 7 і др.). Ва многіх школах адсутнічаюць прадуманыя планы выхаваўчай работы. Сярод часткі настаўнікаў пануюць шкодныя настроі, што іх справа толькі вучыць, а выхаваннем няхай займаюцца другія. Піонерская работа ў школах не наладжана, не арганізавана пазашкольная работа, не працуюць бібліятэкі. Адпачынак дзяцей у часе перапынкаў не арганізаван.

Адсутнасць выхаваўчай работы і нізкая дысцыпліна немінуча зніжае эфект вучэбнай работы, паспяховасць вучняў. Асобныя настаўнікі дрэнна рыхтуюцца да ўрокаў, што ў сваю чаргу зніжае дысцыпліну ў класе.

Бюро гаркома партыі абавязала гарадскі аддзел народнай асветы неадкладна распрацаваць план канкрэтных мерапрыемстваў для палепшання вучэбна-выхаваўчай работы, да 15 кастрычніка правесці па гэтаму пытанню нараду дырэктараў і загадчыкаў навучальных частак школ. Гарадскі аддзел народнай асветы абавязан забяспечыць, каб у кожнай школе, у кожнага кіраўніка класа быў зацверджаны дырэктарам план выхаваўчай работы, сістэматычна правяраючы яго выкананне. Горана даручана сістэматычна правяраць якасць падрыхтоўкі настаўнікаў да ўрокаў, арганізаваць работу метадычных аб'яднанняў у школах, паладзіць перадачу вопыту больш падрыхтаваных настаўнікаў маладым, забяспечыць нармальную работу школьных бібліятэк, папоўніўшы іх літаратурай; арганізаваць работу гарадской дзіцячай бібліятэкі, падабраўшы для яе належнае памяшканне.

Гарадскі камітэт партыі прызнаў адной з важнейшых задач школ вядзенне педагагічнай прапаганды сярод насельніцтва. Горана і дырэктарам школ прапанавана паладзіць работу бацькоўскіх камітэтаў, арганізаваць для бацькоў цыкл лекцый, рэгулярна праводзіць сходы бацькоў. Бюро гаркома прызнала неабходным склікаць у бліжэйшыя дні сход комуністаў, дзеці якіх навучаюцца ў школе № 15 для абмеркавання пытання аб выхаваўчай рабоце ў школе і задачах бацькоў. Первічным партарганізацыям даручана арганізаваць для рабочых і служачых рад дакладаў і гутарак па пытанню аб комуністычным выхаванні дзяцей, практыкаваць у асобных выпадках заслухоўванне на партсходах дакладаў некаторых комуністаў аб вучобе і выхаванні сваіх дзяцей.

Адзначыўшы зусім нездавальняючую работу комсамольскіх арганізацый у школе і дрэннае кіраўніцтва гэтым важнейшым участкам работы з боку гарадскога камітэта комсамола, гаркома партыі даручыў гарадскому камітэту комсамола абмеркаваць на пасяджэнні бюро пытанне аб рабоце комсамольскіх і піонерскіх арганізацый у школе, прыняўшы рад рашучых мер для палепшання іх работы, умацаваць саставу піонер-работнікаў у школах.

У сувязі з тым, што ў горадзе выяўлен рад фактаў парушэння закона аб усеагульным навучанні, гарадскому аддзелу народнай асветы прапанавана да 15 кастрычніка правесці праверку па ўсіх школьных раёнах горада і забяспечыць паталоўны ахоп дзяцей школьнага ўзросту школай.

Антырэлігійная прапаганда

Аддзел прапаганды і агітацыі Брэсцкага гаркома партыі ў апошні час некалькі ўзмацніў антырэлігійную прапаганду ў горадзе.

За апошнія два тыдні для рабочых, служачых і членаў прамысловых арцеляў прачытана 20 лекцый і дакладаў на антырэлігійныя тэмы. На іх прысутнічала больш 1800 чалавек.

Паўсямесна лекцыі выклікалі жывы інтарэс працоўных, якія просяць часцей наладжваць для іх папулярна-навуковыя даклады і лекцыі.

Каштоўным з'яўляецца тое, што для правядзення гэтай работы ўпершыню прыцягнуты настаўнікі (Эрлік, Рот, Павіна і іншыя).

Ёсць поўная магчымасць падабраць значную групу кваліфікаваных антырэлігійнікаў і стварыць для іх семінар.

Неабходна, каб антырэлігійная прапаганда праводзілася не кампанейскі, а рэгулярна, па добра прадуманаму плану.

А. Майсеяў.

На шахце 4-21 ім. Молатава (трэст Сталінвугаль, Данбас) парторг шахты тав. Іванаў праводзіць кансультацыю з комуністамі, самастойна вывучаючымі Гісторыю партыі. Злева направа: дзесятнік М. Т. Гуржый, забойшчык Р. А. Жалтоў, парторг А. Ф. Іванаў і брыгадзір навалаадбойшчыкаў І. М. Алістратаў.

Фота Е. Кома — Фота ТАСС.

Аб лекцыях для кандыдатаў партыі

У сістэме работы па выхаванню кандыдатаў партыі лекцыям належыць адно з важных месц. Змястоўная і цікавая лекцыя на актуальную палітычную тэму, па тэаретычнаму пытанню, бязумоўна кожнаму кандыдату партыі можа сур'ёзна дапамагчы ў яго рабоце над павышэннем ідэйна-палітычнага ўзроўню.

Брэсцкі гарком партыі за апошні час правёў для кандыдатаў партыі дзве такіх лекцыі. Адна лекцыя была прачытана ў канцы верасня на тэму: „Статут большэвіцкай партыі", другая — 8 кастрычніка на тэму: „Праграма большэвіцкай партыі".

Пачын вельмі добры. Але гэтага нельга сказаць аб якасці прачытаных лекцый. Яны і па зместу і асабліва па сваёй форме былі не на высокім узроўні. Асабліва гэта адносіцца да апошняй лекцыі, якую чытала кансультант гаркома партыі тав. Смалавік.

Перад лектарам стаяла вельмі адказная задача — даступна мовай расказаць кандыдатам партыі аб значэнні праграмы партыі, яе тэаретычных асновах, і растлумачыць некаторыя вузлавыя пытанні (прыкладна ў рамках таго, што сказана ў „Кароткім курсе гісторыі ВКП(б)", узбудзіць інтарэс да вучобы, дапамагчы таварышам узяцца за вывучэнне асноў марксізма - ленінізма, вывучэнне праграмы партыі.

Лектар з гэтай задачай справілася нездавальняюча. За адну гадзіну тав. Смалавік „галопам праскакала" па ўсёй праграме, не раскрыўшы перад слухачамі ні аднаго з закранутых пытанняў.

Гаворачы аб партыі повага тыпу, тав. Смалавік абмежавалася літаральна наступным: „Таварыш Сталін у „Пытаннях ленінізма" тлумачыць, чаму ва ўмовах імперыялізма рабочаму класу патрэбна партыя новага тыпу". І ўсё.

Застанаўліваючыся на рабоце VIII з'езда партыі, які выпрацаваў і зацвердзіў дзейнічаючую зараз праграму, лектар адзначыла, што ў той перыяд у нашай краіне было 5 эканамічных укладаў, не даўшы характарыстыкі ўкладам, назваўшы адзін дробнатаварны ўклад.

Аб краяўгольным камені марксізма-ленінізма, аб галоўным у праграме нашай партыі — дыктатуры пролетарыята — тав. Смалавік гаварыла таксама вельмі мала, яна не дала слухачам нават элементарнага паняцця аб тым, што такое дыктатура пролетарыята?

Ці можна пасля гэтага здзіўляцца, што лекцыя не выклікала актыўнасці аўдыторыі і, як заўважыла сама лектар, „кой-хто ў залі драмаў".

Яшчэ аб адным варта сказаць. На першай лекцыі прысутнічала каля 50 кандыдатаў, на другой толькі 30. Гэта сур'ёзны дакор не толькі аддзелу прапаганды гаркома партыі за несур'ёзную падрыхтоўку лекцый але і кіраўнікам многіх первічных партыйных арганізацый, якія і пасля пленума гаркома сур'ёзна не заняліся яшчэ пытаннем ідэйнага выхавання кандыдатаў.

Ал. Галін.

Платная лекцыя

Аддзел прапаганды і агітацыі Ружанскага райкома КП(б)Б арганізаваў 8 кастрычніка першую платную лекцыю на тэму „Вучэнне Леніна-Сталіна аб дзяржаве".

Не гледзячы на кароткі тэрмін, які меўся для арганізацыйнай падрыхтоўкі, лекцыя прайшла добра. Было прадана 287 білетаў.

Дакладна ў вызначаны час пачалася лекцыя. Партыйна совецкі актыў, урачы, настаўнікі ўважліва слухалі лектара т. Кірпоса, які добра падрыхтаваўся да лекцыі.

У прыватнай гутарцы пасля лекцыі многія слухачы выказалі пажаданне, каб часцей наладжваліся падобныя лекцыі.

У бліжэйшыя дні намечана арганізаваць 2 лекцыі на тэму: „Сталін аб нацыянальным пытанні".

Крычэўскі.

Заваёвана заможнае жыццё

12 сакавіка — знамянальны дзень для сялян вёскі Крыўляны, Рэчыцкага сельсавета, Камянецкага раёна. У гэты дзень 38 сялянскіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак вёскі аб'ядналіся ў сельскагаспадарчую арцель, якой далі імя таварыша Варашылава.

Высокаякасна была праведзена веснавая сяўба. Багаты ўраджай зернавых культур калгас убраў без страт за 14 дзён, своечасова разлічыўся з дзяржавай па плацяжах, поўнасцю выканаў план натураплаты за работу машына-трактарнай станцыі.

У калгасе своечасова правялі сяўбу азімых на плошчы 107 гектараў замест плана ў 95 гектараў. 87 гектараў азімых засеяна радковай сеялкай. Калгаснікі заклалі моцны фундамент для атрымання высокага ўраджаю яравых культур у будучым годзе: на зяблі ўзнята 160 гектараў.

Пастанова партыі і ўрада аб малацьбе зернавых культур знайшла гарачую падтрымку калгаснікаў. Пусціўшы ў ход дзве малатарні, калгас за сем дзён поўнасцю закончыў малацьбу зернавых. Намалочана 572 цэнтнеры жыта, 334 цэнтнеры яравых культур. Прыклад стаханаўскай работы па малацьбе паказалі брыгадзір Садоўскі, калгаснікі Раман і Іосіф Жук, калгасніцы Ефрасіння Жук, Марыя Дошчык і іншыя.

У сучасны момант калгас арганізавана праводзіць уборку бульбы. Калгасніцы Маня Жук, Марыя Дошчык і іншыя сістэматычна перавыконваюць нормы выпрацоўкі на ўборцы.

Вырасла пагалоўе калгаснай жывёлы. План укамплектавання ферм выканан поўнасцю. На малочна-таварнай ферме налічваецца 38 галоў племяннай жывёлы. На свінагадоўчай ферме 8 свінаматак і 20 парасят. Коні калгаса маюць укормленасць вышэй сярэдняй. Праведзена належная папрыхтоўка да зімоўкі. Добра абсталяван хлеў для свіней і канюшня. Калгас прыступіў да збору сена другога ўкосу на плошчы 15 гектараў. Закладзена 60 тон сілосу.

Калгаснікі добра зразумелі значэнне калгаснай дысцыпліны і ўсе яны штодзённа і арганізавана выходзяць на работу. Выраслі выдатныя людзі — стаханаўцы калгаснай працы.

У сям'і калгасніка Жука Якава — чатыры працаздольных. Ён сам мае 57 год, працуе вартаўніком, жонка Александра, сын Раман і нявестка Ольга працуюць на палявых работах. Яны ў чацвярых да першага кастрычніка выпрацавалі 635 працадзён. Калгаснік Аляксандр Гук выпрацаваў 484 працадні. Калгасніца Матрона Жук (даярка) у час уборачнай выходзіла на палявыя работы, выпрацавала 298 працадзён. Стаханавец паляводчай брыгады Нікіта Базыка — 300 працадзён. Гэта далёка няпоўны пералік лепшых перадавых людзей калгаса, якія высока ўзнімаюць сцяг соцыялістычнага спаборніцтва.

Па папярэдніх падліках на кожны працадзень калгаснікі атрымаюць па 6 з лішнім кілограмаў зернавых, 15—16 кілограмаў бульбы і 60 капеек грашмі. Праўленне калгаса ўжо выдала авансам па 3,6 кілограма зернавых на працадзень.

Гэта рэзультат дружна арганізаванай, стаханаўскай работы калгаснікаў на блага развіцця свайго калгаса і яго арганізацыйна-гаспадарчага ўмацавання.

Калгаснікі зажылі новым радасным, заможным жыццём.

М. Гурэвіч.

Фермы калгаса імені Сталіна

Калгаснікі сельгасарцелі імені Сталіна, Жабінкаўскага раёна, за невялікі адрэзак часу прарабілі вялікую работу па развіццю жывёлагадоўлі. У калгасе створаны 4 жывёлагадоўчыя фермы. Малочна-таварная мае 31 дойную карову і 22 галавы маладняка, на аўцагадоўчай 29 галоў, на конеферме — 22 галовы і на свінагадоўчай 6 свінаматак.

У адпаведнасці з рашэннем партыі і ўрада аб развіцці грамадскай жывёлагадоўлі ў калгасах малады калгас імені Сталіна ўжо мае ў наяўнасці нават больш галоў жывёлы, чым яму патрэбна мець згодна маючайся плошчы зямлі.

Для развіцця жывёлагадоўлі ў калгасе створаны ўсе ўмовы і калгас скарыстоўвае іх. Абсталяваны, прыведзены ў парадак і ацеплены да зімы канюшня і свінарнік; асабліва добрае, светлае памяшканне абсталявана для малочна-таварнай фермы.

Калгас мае добрую кармавую базу. Усё пагалоўе на зіму забяспечана поўнасцю грубымі і сакавітымі кармамі. Ужо складзен кармавы баланс. Фермы ўкамплектаваны даглядчыкамі — людзьмі вопытнымі, якія любяць жывёлагадоўлю.

Калгас змагаецца за высокую прадукцыйнасць жывёлагадоўчых ферм і ўжо дабіўся нямалых поспехаў. На свінатаварнай ферме ўсе 6 свінаматак далі прыплод па 10 парасят кожная. Даярка дабіліся добрых удояў малака. Даярка Прыдатак Марыя абслугоўвае 10 кароў, сістэматычна перавыконвае свае нормы. Асабліва высокіх удояў дабілася яна ад каровы Мецік (галандскай пароды). За тры месяцы ад гэтай каровы надоена 510 літраў малака.

Калгас паспяхова заканчвае сельскагаспадарчы год. Ужо поўнасцю зроблен разлік з дзяржавай па ўсіх відах паставак, як па зярну, мясу і іншых. Закончана таксама малацьба. Багацце прадуктаў абяцае маладым калгаснікам першы год калгаснага жыцця. Калгаснікі ўжо атрымалі аванс па тры з палавінай кілограмы зернавых на працадзень. Пры канчатковым размеркаванні яны атрымаюць па 8 кілограм зернавых на кожны працадзень.

Р. Каралёў.

Высокая вага працадня

Багаты ўраджай атрымалі калгаснікі сельскагаспадарчай арцелі імені Варашылава, Камянец-Жыравіцкага сельсавета, Брэсцкага раёна. У калгасе заканчваецца малацьба збожжа.

Добра працуе трактарчот Аляксей Кучэрук. Малатарня работае без прастояў. Калгаснікі малоцяць збожжа ў дзве змены. За змену яны намалочваюць больш самі тон зярна.

Лепшыя прыклады на малацьбе паказваюць калгасніцы Аляксандра Вольская, Марыя Назарук, Анна Несцяровіч, Надзя Казёл, калгаснікі Тарас і Іўстрат Грода і іншыя.

Па зробленых праўленнем калгаса падліках калгаснікі атрымаюць на кожны працадзень па 6 кілограмаў зернавых і па 1[illegible] кілограмаў бульбы.

П. Казёл.

НАША РАДЗІМА

КІРГІЗСКАЯ ССР

На паўдзённым усходзе СССР, на граніцы з Кітаем, размешчана Кіргізская Совецкая Соцыялістычная Рэспубліка. Плошча рэспублікі — каля 197 тысяч квадратных кілометраў. Насельніцтва — 1 мільён 460 тысяч чалавек, з якіх дзве трэці — кіргізы.

Совецкая Кіргізія — горная краіна. У некалькіх месцах яе прарэзваюць плодародныя далины рэк Чу, Талас і частка Ферганскай далины. Высока к небу ўзнімаюцца снегавыя хрыбты гор Тянь-Шаня і Паміра-Алая з багацейшымі пасбішчамі на прадгор'ях.

У дарэволюцыйны час Кіргізія была краінай вандравання і адсталага земляробства. Вандроўнікі — кіргізы былі адным з самых прыгнечаных народаў царскай Расіі: жылі яны ў цемры і бескультурыі. Царскі ўрад накіроўваючы ў Кіргізію перасяленцаў, аднаў у 1916 годзе ў карэннага кіргізскага насельніцтва больш 6 мільёнаў дзесяцін лепшых пасбішчных і палівных зямель. Звыш паловы жывёлы належала тады баям (кулакам) і манапам (князькам).

Працоўны народ не меў зямлі і вымушан быў арандаваць яе ў багацеяў у парадку іздольшчыны. У кіргізаў не было сваёй пісьменнасці, насельніцтва было амаль пагалоўна непісьменным.

Совецкая ўлада і партыя большэвікоў падняла кіргізкі народ з цемры і невуцтва, зрабілі яго роўнапраўным у сям'і народаў Совецкай краіны, адрадзілі яго творчыя сілы.

За годы совецкай улады Кіргізія ператварылася ў адну з квітнеючых соцыялістычных рэспублік вялікага Совецкага Саюза. Багацейшыя прыродныя багацці Кіргізіі, ляжаўшыя да революцыі амаль нескарыстанымі: каменны вугаль, жалезная руда, нафта, золата, свінец і др. — пастаўлены на службу народнай гаспадарцы краіны. У Кіргізкай рэспубліцы выраслі вугальныя шахты, свінцовыя рудзікі, мясакамбінат, бавоўнаачышчальныя і цукровыя заводы, бавоўняныя і жывёлагадоўчыя соўгасы, машына-трактарныя станцыі.

Буйная прамысловасць Кіргізскай рэспублікі дае цяпер прадукцыі амаль у 100 раз больш чым да революцыі. Каменнавугальныя шахты Кіргізіі забяспечваюць вугалем сярэднеазіяцкія рэспублікі: Узбекскую, Таджыкскую, Туркменскую.

За годы сталінскіх пяцігодак у Кіргізкай рэспубліцы вытвараны вялікія арашальныя работы. Самі калгаснікі пабудавалі нямала арашальных каналаў. У рэзультаце гэтага палівныя землі расшыраны больш чым на 760 тысяч гектараў.

У калгасах Кіргізіі аб'еднана 97,7 проц. сялянскіх гаспадарак. Уходзяць у мінулае паходныя юрты вандраўнікоў. Калгасы абзавяліся ўпарадкаванымі дамамі, жывёлагадоўчымі фермамі, школамі, клубамі.

У калгасах і соўгасах Кіргізіі развіта пасбішная горная жывёлагадоўля. Кіргізія мае вялікія дасягненні ў развіцці жывёлагадоўлі. За апошнія 5 год пагалоўе авец і коз павялічылася на 140 проц., коней—на 46 проц., буйнай рагатай жывёлы—на 72 процанты. Шляхам скрыжавання розных парод павышаецца прадуктыўнасць жывёлы, вырашчваюцца высокапародзістыя авечкі, коні.

Зямля ў калгасах апрацоўваецца не дрыўлянай сахой, як раней у аднаасобных гаспадарках, а пры дапамозе трактараў і розных машын. Калгасы збіраюць багатыя ўраджаі цукровых буракоў, бавоўны, кенафа, канопліі. Чатыры годы падрад Кіргізія ідзе ўперадзе другіх рэспублік і краёў Совецкага Саюза па ўраджайнасці буракоў. У 1939 годзе Кіргізія ў гэтай справе дасягнула сусветнага рэкорду: у сярэднім па рэспубліцы было сабрана 382 цэнтнеры буракоў з гектара. Першае месца ў СССР трымае Кіргізія і па ўраджайнасці бавоўны. Развіццё прамысловасці, сельскай гаспадаркі, гандлю і транспарта набачна палепшыла жыццё кіргізаў. Усюды пазявіліся новыя жылішчы, школы, дзіцячыя дамы, клубы, тэатры, бальніцы.

У рэспубліцы зараз 1754 школы: у 17 раз больш чым да революцыі. У іх навучаецца 317 тысяч дзяцей. Хутка ідзе ліквідацыя непісьменнасці сярод дарослага насельніцтва: дзесяткі тысяч людзей абучаюцца ў школах ліквідацыі непісьменнасці. У Кіргізіі 5 вышэйшых навучальных устаноў і 28 тэхнікумаў, якія выхоўваюць кадры кіргізкай нацыянальнай інтэлігенцыі.

Сталіца Совецкай Кіргізіі — горад Фрунзе — з маленькага захалуснага гарадка ператворана ў культурны цэнтр рэспублікі. Тут выраслі новыя прыгожыя будынкі вышэйшых навучальных устаноў, навуковых інстытутаў, тэатраў.

Скошана 85.511 тысяч гектараў каласавых

На 5 кастрычніка ў калгасах і соўгасах краіны скошана 85.511 тысяч гектараў каласавых. План выканан на 99,9 процанта.

У першай пяцідзёнцы кастрычніка завяршылі касавіцу хлябоў Беларуская ССР, Башкірская, Бурат-Мангольская і Немцаў Паволжа АССР, Новасібірская і Чэлябінская вобласці.

Выканалі план касавіцы соўгасы Наркамсоўгасаў.

На 5 кастрычніка каласавыя абмалочаны з плошчы 75.177 тысяч гектараў — 88 процантаў скошаных хлябоў. Закончылі абмалот каласавых калгасы Паўночна-Осецінскай АССР.

(ТАСС).

УСЕСАЮЗНАЯ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЯ ВЫСТАЎКА

Экспанат павільёна „Механізацыя" — грузавы аўтамабіль „ЗІС-31" з газагенератарнай устаноўкай НАЦІ-Г-23". Грузападзёмнасць машыны 2500 кг. Вага аўтамабіля — 3480 кг., магутнасць рухавіка (пры 2400 абаротах у мінуту) 45 л.с., максімальная хуткасць — 50 км. у гадзіну, працуе на дрывасным вугалі, расход паліва на 100 км. 5[illegible] кг., запас хода на адной загрузцы бункера 65-70 км.

Фота А. Сакаповскай. — Фота-ілюстр. ТАСС.

ЧЫРВОНАСЦЯЖНЫ АНСАМБЛЬ ЧЫРВОНААРМЕЙСКАЙ ПЕСНІ І ПЛЯСКІ САЮЗА ССР

192

Чырвонасцяжны Ансамбль быў арганізаван у 1928 годзе ў саставе 8 спевакоў, 2 танцораў, баяніста і чытача.

Не гледячы на невялікі саставу — гэты калектыў з'явіўся першым прапагандыстам баявых песень аб Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, песень, якія сталі любімымі не толькі сярод чырвонаармейцаў, камандзіраў і палітработнікаў, але і выключна папулярнымі сярод многамільённага насельніцтва нашай радзімы. У адрозненне ад раней існуючых хораў і капел Чырвонасцяжны Ансамбль злучыў у сабе вакал, музыку і танец.

Клапатлівая рука партыі і кіраўнікоў Чырвонай Арміі вырасціла з чырвонаармейцаў, малодшых камандзіраў, былых удзельнікаў чырвонаармейскай самадзейнасці, сапраўдных майстраў народнай творчасці.

Першай работай ансамбля была гісторыя 22-й Краснадарскай дывізіі ў песнях і плясках, якая геройна ваявала пад кіраўніцтвам М. В. Фрунзе.

Другая праграма была прысвечана слаўнай 1-й конной Арміі.

У дні канфлікта на КВЖД, тады яшчэ малады, ансамбль атрымаў сваё першае хрышчэнне, — ён выступіў на лініі агня пад грохат гармат і ружэйнай стральбы.

У 1933 г. выступленне Ансамбля было праслухана таварышам Сталіным, тав. Варашылавым і членамі ўрада. З гэтага часу работа Ансамбля працякае пры выключнай увазе з боку таварышоў Сталіна і Варашылава. Сваімі ўказаннямі яны дапамагаюць Ансамблю пашыраць і стварацъ свой рэпертуар.

За час з 1930 г. па 1937 г. Ансамбль пабываў амаль ва ўсіх округах РСЧА. І ўсюды ў сваіх песнях Ансамбль праслаўляе вялікую сацыялістычную эпоху, яе выдатных людзей, узнімаючыся да вяршыні мастацкага пафаса ў песнях аб вялікім правадыру народаў — Сталіне, аб слаўным палкаводцы Чырвонай Арміі — першым маршале Савецкага Саюза Кліме Варашылаве.

Танчайшае піанісімо італьянскай оперы з „Рыголето"—Верді, з „Фаўста" — Гуно, змяняецца рускімі старадаўнымі песнямі „Канава", „Мяцеліца", „Бярозанька".

Трывала ўвайшлі ў рэпертуар Ансамбля песні савецкіх кампазітараў — песні з оперы „Ціхі Дон", „Паднятая цаліна" — муз. Дзержынскага. Да многіх песняў музыку напісаў мастацкі кіраўнік Ансамбля А. В. Александраў.

Гордасць Чырвонасцяжнага Ансамбля — гэта мастацтва юнасці, здароўя, сілы, лоўкасці; мастацтва, дэманстрыруючае магутнасць савецкага народа і яго слаўнай Чырвонай Арміі.

У 1935 г. Ансамбль узнагароджан Чырвоным сцягам ЦВК СССР з орденам Чырвонай Звязды на ім, а рад работнікаў — ордэнамі Саюза ССР.

У 1937 г. Ансамбль быў накіраван заграніцу ў Парыж і Прагу, там канцэрты прайшлі як сапраўднае свята савецкага мастацтва.

Прыехаўшы з-за граніцы Ансамбль быў накіраван на Далёкі Усход, дзе яму прыйшлося атрымаць другое баявое хрышчэнне ў час падзей на возеры Хасан.

Сваімі поспехамі Ансамбль ва многім абавязан свайму мастацкаму кіраўніку народнаму артысту СССР ордэнаносцу прафесару А. В. Александраву, які бяззменна з 1928 года кіруе гэтым выдатным Ансамблем.

Упрыгожваюць Ансамбль салісты-ордэнаносцы Твердахлебаў, Балаеў, Лаут, Нікіцін, Панкоў, Лягін, Пашуцін. У хореаграфічнай групе заслужаныя артысты РСФСР ордэнаносцы-танцоры тт. Максімаў і Палежаеў, Светланаў і Барысаў.

Чырвонасцяжны Ансамбль прабудзе ў Брэсце тры дні; за якія абслужыць байцоў, камандзіраў і палітработнікаў нашага гарнізона, і 14 кастрычніка дасць у памяшканні гартэатра адкрыты канцэрт для працоўных горада.

Пажадаем слаўнаму калектыву новых творчых поспехаў ва славу нашай радзімы і Рабоча-Сялянскай Чырвонай Арміі, на радасць працоўных, на страх ворагам краіны сацыялізма!

П. Абрасімаў.

„Волга... Волга"...

КІНО

На экране кінатэатра імені Горкага дэманструецца выдатная, музыкальная кінакамедыя „Волга — Волга". Фільм з'яўляецца глыбокаказмястоўным. У ім у наяўнасці не толькі цудоўная музыка, але і выключная ігра артыстаў. Галоўныя ролі ў карціне выконваюць такія папулярныя і добразнаёмыя глядачу артысты, як Орлова, Ігар Ільінскі, Валодзін і інш. Становішча ў камедыі тое, што яна знаёміць глядача з прыгожасцю нашых казачных дзён, з ростам талентаў у нашым народзе, з яго невычарпальнай радасцю і весялем.

З другога боку фільм знаёміць з тупым і бездарным чалавекам-бюракратам, кіраўніком, Бывалавым, неўмеючым цаніць мастацкія здольнасці.

Дзея пачынаецца так: На імя кіраўніка „дробнай мясцовай прамысловасці" далёкага і невялікага горада Мелкаводска на Волзе, Бывалава, з Масквы паступае тэлеграма. У ёй прапануецца разгарнуць у калектыве самадзейнасць і лепшыя нумары даставіць у Маскву на Усесаюзную алімпіяду. Бывалаў сустракае тэлеграму абыякава, ён заяўляе, што самадзейнасцю не будзе займацца, бо ў даным горадзе няма і не можа быць талентаў.

Актыўная ўдзельніца самадзейнасці лістаносец Дуня была крайне пакрыўджана словамі бюракрата Бывалава. Яна рашыла паказаць яму, што ў Мелкаводску незлічоная колькасць здольных, таленавітых людзей. Дуня арганізавала і пасставіла самадзейны калектыў. Сюды куды-б толькі ні трапіў Бывалаў яго сустракалі з песнямі, музыкай, пляскамі. У гастраўе спявалі афіцыянты, калгаснікі — дзеці. Кожнае перакрыванне вуліцы ператваралася ў месца для выступлення таленавітага мастацкага калектыва. Сама Дуня часта чаравала яго бадзёрай, таленавіта выконваемай песняй.

Бывалаў пад націскам мас прымушан быў згадзіцца на паездку ў Маскву. Ён адабраў для самадзейнасці нумары толькі са „сваёй сістэмы". Настаў доўгачаканы дзень. Са сваёй самадзейнасцю Бывалаў на старэнькім параходзе „Севруга" накіроўваецца ў Маскву. Астатнія ўдзельнікі самадзейнасці горада разам з Дуняй плывуць на парусніку. На рацэ яны імкнуцца перагнаць здзін другога. З-за цішы нічога не атрымоўваецца. Пароход і парусник садзяцца на мель.

Дуня пераходзіць на пароход. Ёю напісаную песенку пра Волгу на яе просьбе аркестранты запісваюць на ноты. На параходзе ўзнімаецца моцны вецер, ён зрывае з яго і разносіць па шырокай рацэ лісткі з запісанай песенкай. Лісткі падбіраюць на іншых параходах і выдатная песня становіцца здабытком многіх. Уся Волга напаўняецца яе бадзёрымі мелодыямі.

У Маскве на алімпіядзе песню пра Волгу спяваюць дарослыя, дзеці, спяваюць усе калектывы. І песня—красавіца разносіцца над Масквой, як сімвал радасці, шчасця і бязмежнай любві да радзімы:

Наше счастье, как май молодое,
Нашу силу нельзя сокрушить,
Под счастливой советской
звездою
Хорошо и работать и жить!"

Фільм заканчваецца злым высмейваннем тупога і бездарнага Бывалава, адстаўшага ад бурнага і радаснага жыцця нашай радзімы.

Г. Паўлаў.

Англа-германская вайна

Германскія паведамленні

БЕРЛІН, 11 кастрычніка. (ТАСС). Вярхоўнае камандванне германскай авіяцыі паведамляе: „Галоўны ўдар германскай авіяцыі ўчора быў накіраван супроць Лондана. Адзначаны шматлікія ўзрывы і пажары. Германскія бамбардыроўшчыкі скінулі бомбы на многалікія ваенныя аб'екты Ліверпуля, Біркенхеда, Манчэстэра. У Паўднёвай і Сярэдняй Англіі паспяхова бамбардыраваны партовыя збудаванні, ваенныя прадпрыемствы і базы снабжэння. Бамбардыраваны аэрадромы на заходнім і паўднёвым узбярэжжы Англіі. Разбураны ангары і сховішчы. Марская артылерыя абстрэлівала Дуўр. Адзначаны попаданні ў судны і другія важныя аб'екты.

У Заходняй і Паўночна-Заходняй Германіі англійскія самалёты атакавалі розныя гарады і прамысловыя збудаванні. Аб'екты ваенна-гаспадарчага значэння не пацярпелі. Разбурана некалькі жылых дамоў.

Страты непрыяцеля ўчора саставілі 12 самалётаў. 4 германскіх самалёты не вярнуліся на свае базы"

БЕРЛІН, 11 кастрычніка (ТАСС) Германскае інфармацыйнае бюро паведамляе, што ў ноч на 9 кастрычніка англійская авіяцыя ўпоўз скінула бомбы буйнага калібру на два жылых кварталы ў бельгійскіх гарадах Льеж і Герстал. У Льежы разбураны 4 дамы.

Англійскія паведамленні

ЛОНДАН, 11 кастрычніка. (ТАСС) Афіцыяльна паведамляецца, што 10 кастрычніка германскія самалёты зрабілі некалькі налётаў на гарады, распаложаныя на ўзбярэжжы графства Кент, Сасекс, а таксама ў вусці Тэмзы. Бомбы скінуты таксама ў адным з раёнаў Лондана. Прычынены невялікія матэрыяльныя страты, колькасць афяр нязначна. Учора знішчана 4 германскіх самалёты, 4 англійскіх знішчальнікі не вярнуліся на свае базы.

Агенцтва Рэйтэр перадае, што 10 кастрычніка германская далёкабойная артылерыя абстрэлівала Дуўр. Бамбардыроўка працягвалася 30 мінут. Страт і афяр няма.

Атрады англійскіх бамбардыроўшчыкаў падверглі бамбардыроўцы пазіцыі германскай артылерыі. Самалёты скінулі вялікую колькасць бомб. Зроблен налёт на Кале.

Паветраная вайна

ЛОНДАН, 11 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Рэйтэр, учора над Ла-Маншам адбываліся жорсткія паветраныя баі. Толькі намногім германскім самалётам удалося дасягнуць лонданскага раёна. Страты ад бамбардыроўкі і колькасць афяр нязначны. Збіта 5 самалётаў працўніка. Англійская авіяцыя таксама страціла 5.

У ноч на сёння бомбы скінуты ва многіх пунктах Лондана і яго ваколіц. Пашкоджаны камерчэскія прадпрыемствы, узнікшыя пажары ліквідаваны. У сельскіх раёнах Уэльса прычынены нязначныя страты.

Германскія самалёты атакавалі таксама тры гарады Паўночна-Усходняй Англіі.

11 кастрычніка спрабаваўшы прарвацца к Лондану атрад германскіх самалётаў, а таксама паявіўшыйся пад узбярэжжам атогнаны.

Выступленне Бальфура

ЛОНДАН, 11-га кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у палаце абшчын намеснік міністэрства авіяцыі Бальфур заявіў, што ўзмацненне, а таксама эфектыўнасць англійскай зенітнай артылерыі даказаны рэзультатамі начной заграджальнай стральбы. Заграджальны агонь найбольш дзейсны, папярэджваючы сродак супроць паветраных налётаў, якімі непрыяцель спадзяваўся разбіць англійскую знішчальную авіяцыю і другія віды абароны.

Будаўніцтва танкаў у Канадзе

ЛОНДАН, 11 кастрычніка. (ТАСС). Як паведамляе агенцтва Рэйтэр, канадскі міністр ваеннага забеспячэння заявіў, што ў Канадзе знаходзяцца ў вытворчасці 3 тысячы танкаў для англійскай і канадскай арміі. Як мяркуюць, будуюцца пераважна сярэднія і буйныя танкі па лепшых англійскіх і амерыканскіх узорах.

Зводка італьянскага камандвання

РЫМ, 11 кастрычніка. (ТАСС). У зводцы італьянскага камандвання паведамляецца:

„Адно наша паветранае злучэнне бамбардыравала аэрапорт Порт - Судана, знішчыўшы 15 англійскіх самалётаў.

Ва Усходняй Афрыцы праціўнік прадпрыняў два беспаспяховых нападзенні на нашу тэрыторыю.

Англійская авіяцыя зрабіла таксама налёты на Гура, Тозелі і Декамерэ. Пашкоджанні нязначныя".

Абмежаванне спажывання масла ў Італіі

Італьянская газета „Стампа" 4 кастрычніка змясціла распараджэнне італьянскага міністэрства карпарацый, што ў сувязі з увядзеннем картак на тлушчы забараняецца водпуск сліўачнага масла для шырокага спажывання ў рэстаранах, гасцініцах, трактірах, кафе.

11 кастрычніка (ТАСС).

Патапленне французскай падводной лодкі „Аякс"

ЛІОН, 11 кастрычніка. (ТАСС) Агенцтва Гавас перадае наступнае паведамленне французскага адміралцейства: „Ужо некалькі дзён не было звестак аб французскай падводнай лодцы „Аякс". Згодна паведамленню з англійскай крыніцы, падводная лодка патоплена, увесь экіпаж „Аякса" выратаван і знаходзіцца ў Фрытаўне (заходняе ўзбярэжжа Афрыкі).

Барацьба са спекуляцыяй у Парыжы

ЛІОН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Гавас, камітэт па назіранню за цэнамі ў Парыжы перадаў у суд 65 спраў за спекуляцыйнае павышэнне цэн. Паліцэйскія ўлады закрылі за гандаль па павышаных цэнах 18 гандлёвых прадпрыемстваў. Закрыта некалькі магазінаў па продажу тканяў і модных рэчаў у центры Парыжа. Выяўлен продаж абутку па спекулятыўных цэнах. За апошнія дні трыбунал дэпартамента Сены прыгаварыў 29 чалавек да турэмнага зняволення тэрмінам да двух месяцаў за гандаль па павышаных цэнах.

У Лондан выехала амерыканская ваенная камісія

НЬЮ-ЙОРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Як перадае агенцтва Юнайтэд Прэс, ваенны міністр ЗША Сцімсон паведаміў, што ў Лондан выехала амерыканская ваенная місія для вывучэння англійскай абароны супроць паветраных нападзенняў. У саставу місіі ўваходзяць памочнік начальніка амерыканскай авіяцыі генерал Янт, генерал Чэні, капітан Сэвіл.

Заява камандуючага паветраным флотам Галандскай Індыі

НЬЮ-ЙОРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс з Манілы, з востраў Явы ў Манілу па самалёце прыбыў камандуючы паветраным флотам Галандскай Індыі маёр Ван Хаселен, які накіроўваецца ў ЗША з афіцыяльнай місіяй. Па словах карэспандэнта, Ван Хаселен заявіў, што ўрад Галандскай Індыі намеран закупіць за ніўпы разлік такую колькасць амерыканскіх самалётаў, якую магчыма будзе атрымаць у ЗША. Далей Ван Хаселен дадаў, што Галандская Індыя гатова супраціўляцца любому нападзенню на яе.

Забойства мэра Шанхая Ку Сяо-аня

ШАНХАЙ, 11 кастрычніка. (ТАСС). Сёння раніцой у сваёй рэзідэнцыі, размешчанай побач са штабам японскай жандармерыі ў раёне Хонк'ю, забіт мэр Вялікага Шанхая Ку Сяо-ань.

Амерыканскія грамадзяне рыхтуюцца пакінуць Далёкі Ўсход

ВАШЫНГТОН, 11 кастрычніка. (ТАСС). У гутарцы з прадстаўнікамі друку дзяржаўны сакратар ЗША Хэл заявіў, што ўрад разглядвае ў сучасны момант пытанне аб дадатковай пасылцы параходаў на Далёкі Ўсход для эвакуацыі адтуль амерыканскіх грамадзян.

Па паведамленню токійскага карэспандэнта агенцтва Асошыэйтэд Прэс, многія амерыканцы рыхтуюцца пакінуць Японію. Па маючыхся вестках, не менш 250 амерыканцаў ужо закупілі месцы на параходах. Карэспандэнт адзначае, што ўжо зараз, у сувязі з парушэннем нармальнай работы транспарта, многія амерыканцы, якія знаходзяцца ў Паўночным Кітаі і ў Інда-Кітаі, пазбаўлены магчымасці выехаць з гэтых раёнаў.

НЬЮ-ЙОРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Шанхайскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс, паведамляючы аб забойстве Ку Сяо-аня, указвае, што, па думцы іншаземцаў японцы захвацяць міжнародны сетльмент з прычыны „ўстанаўлення парадку". Шанхайскі карэспандэнт агенцтва Асошыэйтэд Прэс паведамляе, што „японскія войскі ператварылі ўвесь раён Хонк'ю ва ўзброены лагер. Вуліцы забарыкадаваны". Карэспандэнт указвае, што гэтыя мерапрыемствы праведзены ў сувязі з забойствам Ку Сяо-аня.

ТОКІО, 11 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Домэй Цусін перадае падрабязнасці забойства мэра Вялікага Шанхая Ку Сяо-аня. Забойца карыстаўся вострым кінджалам або нажом. У Ку Сяо-аня былі перарэзаны артэрыі горла. Акрамя таго, яму нанесена была глыбокая рана.

Рэзідэнцыя Ку Сяо-аня знаходзіцца ў параўнальна намногалюдным раёне Хонк'ю. Дом Ку Сяо-аня днём і ноччу ўзмоцнена ахоўваюць звыш 20 спецыяльна абучаных паліцэйскіх. Раён Хонк'ю саставляе частку міжнароднага сетльмента. Гэта частка сетльмента ператворана ва ўзброены лагер. Японскія паліцэйскія патруліруюць вакол дома Ку Сяо-аня. Усе ўваходы ў Хонк'ю з другіх раёнаў сетльмента ўзмоцнена ахоўваюцца, і ўсе праходжыя падвяргаюцца вобыску.

Прыбыццё генерала Вейгана ў Алжыр

БЕРЛІН, 10 кастрычніка. (ТАСС). Агенцтва Трансоцеан паведамляе, што генерал Вейган прыбыў у Алжыр, дзе быў сустрэт генерал-губернатарам Алжыра Абрыаль-

Заява каманды амерыканскага парахода

НЬЮ-ЙОРК, 11 кастрычніка (ТАСС). Агенцтва Асошыэйтэд Прэс перадае, што каманда прыбыўшага з Індыі ў Бастон амерыканскага парахода заяўляе, што ў Каламбо (востраў Цэйлон) сканцентравана каля 100 тысяч салдат англійскай арміі.

Узмацненне ваенна-марскога флота ў ЗША

НЬЮ-ЙОРК, 11 кастрычніка. (ТАСС). Па паведамленню агенцтва Юнайтэд Прэс, марское міністэрства Амерыкі прымае 36 падводных лодак, пабудаваных яшчэ ў часе першай сусветнай вайны. Марское міністэрства будуе 81 новую падводную лодку. 124 лодкі ўжо пабудаваны. З падводных лодак створана 5 эскадр. Большая частка іх знаходзіцца ў Ціхім акіяне. Частка падводнага флота нясе патрульную службу ў Атлантычным акіяне.

Святкаванне 29 гадавіны аснавання Кітайскай рэспублікі

ЧУНЦІН, 11 кастрычніка (ТАСС). Учора, у дзень 29 гадавіны аснавання рэспублікі, вуліцы Чунціна з раніцы былі запоўнены дэманстрантамі і атрадамі войск. На центральнай гарадской плошчы адбыўся мітынг, на якім выступіў Чан-Кай-шы. Пасля мітынга войскі, атрады маладзёжнай арганізацыі Саньміячжу („трох народных прынцыпаў") і жаночыя арганізацыі прайшлі на вуліцах да будынка ўрада. Тут адбыўся мітынг, пасля якога дэманстранты адправіліся ў розныя раёны горада для добраахвотных работ па ўборцы вуліц і расчыстцы разбітых бамбардыроўкамі кварталаў. Грамадскія работы, аднак, былі прэрваны сігналамі паветранай трывогі. Дзве групы японскіх самалётаў бамбардыравалі некалькі гарадоў паблізу ад Чунціна.

Ваенныя дзеянні ў Кітаі

У Цэнтральным Кітаі. Баі мясцовага характару ідуць у некалькіх раёнах правінцыі Аньхуэй. На паўднёвым беразе ракі Янцзы ў раёне на паўднёвы захад ад Уху японская калона, колькасцю ў некалькі тысяч чалавек, днямі прадпрыняла наступленне ў раёне Фанчэна, дзе зараз ідуць упартыя баі.

У цэнтральнай частцы правінцыі Аньхуэй кітайцы атакуюць Хэфей і рад другіх пунктаў.

У правінцыі Чжэцзян у 25 кілометрах на захад ад Ханчжоу японскі атрад, колькасцю ў адну тысячу чалавек павёў наступленне на захад і атакаваў горад Лінчань, які адначасова падвергся бамбардыроўцы японскай авіяцыі. Баі ідуць у ваколіцах горада.

У Паўночным Кітаі. 5 кастрычніка кітайскія партызаны мініравалі Нанкін-Шанхайскую чыгунку паблізу станцыі Сучжоу. У рэзультаце ўзорван японскі воінскі поезд. Сярод японскіх салдат налічваецца многа афяр. Знішчана вялікая колькасць узбраення і амуніцыі.

У Паўднёвым Кітаі. У раёне Нанькін-Кунань у правінцыі Гуансі адбываюцца асобныя сутычкі.

11 кастрычніка (ТАСС).

Прыбыццё генерала Дэ Голь у Дуала

ЛОНДАН, 10 кастрычніка (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у аўтарытэтных лонданскіх кругах сёння пацвярджаюць паведамленне друку аб тым, што генерал дэ Голь прыбыў у Дуала (Французскі Камерун). Пасля інцыдэнта ў Дакары дэ Голь заявіў карэспандэнту агенцтва, што ён разлічвае як мага хутчэй устанавіць кантакт са сваімі прыхільнікамі ва Французскай Экватарыяльнай Афрыцы.

Адказны рэдактар Г. Т. МІНЧУКОЎ.

Да ведама ўсіх шофераў і аўтаработнікаў Брэсцкай вобласці

АБЛАСНОЕ УПРАЎЛЕННЕ АЎТАМАБІЛЬНАГА ТРАНСПАРТА ДЗЯРЖАЎТАІНСПЕКЦЫІ ПАВЕДАМЛЯЕ, ШТО 19/X-40 г. Ў 7 ГАДЗІН ВЕЧАРА АДБУДЗЕЦЦА

КАНФЕРЭНЦЫЯ УСІХ РАБОТНІКАЎ АЎТАМАБІЛЬНАГА ТРАНСПАРТА

з парадкам дня:

1) Абмеркаванне соцыялістычнага дагавора з Пінскай вобласцю,
2) Становішча аўтамабільнага транспарта вобласці.

З'явіцца па адраву: г. Брэст, вуліца 17 верасня, дом фізкультуры.

Абл. Упраўленне Аўтатранспарта.

Брэсцкі Выяўленчы камітэт

прымае заказы

на партрэты, карціны, на афармленне святочных калон, будынкаў, вуліц і інш.

Заказы прымаюцца з 11 — 14 і з 19—21 веч.

ДЫРЭКЦЫЯ ВЫЯЎКАМІТЭТА.

Брэст вул. Совецкая 67 (Дом мастака).

ПАВЕДАМЛЕННЕ

16 кастрычніка ў 20 гадзін па маскоўскаму часу склікаецца

СХОД

усіх шахматыстаў і шашыстаў

горада ў памяшканні абласнога камітэта фізкультуры і спорта, праспект 17 верасня, дом № 21.

СЁННЯ Ў КІНОТЭАТРАХ

Кінатэатр „1-га МАЯ"

ЛЮБІМАЯ ДЗЯЎЧЫНА

Кінатэатр імені ГОРКАГА

ВОЛГА, ВОЛГА

Штодзённа 4 сеансы.

Для работы ў заводакіраўніцтве „ГАЛОЎМУКА" у г. Брэсце

ПАТРАБУЮЦЦА рахуннікаводы

Адрас: вул. Менжынскага № 12, Мельзавод № 4.

ГОРТЭАТР

Гастролі Беластоцкага Дзяржаўнага Яўрэйскага тэатра 13 кастрычніка,

СТЭМПЕНЮ

Лірыка-раман, драма ў трох актах (6 карцін)

Пастаноўка цэйтліна В. С.

Пачатак у 9 гадзін вечара. Білеты прадаюцца ў касе тэатра з 12 да 3 гадзін дня і з 6 да 9 гадзін вечара і ў гарадской касе (рог Пушкінскай і Комсамольскай) з 11 гадзін дня да 7 гадзін вечара.

Хутка „Юлис"

Адрас рэдакцыі: г. Брэст, вуліца імені Карла Маркса 29. Тэлефоны 1 — 17, 1—23, 6—15. ... Брэсцкая друкарня. УЦ — 948